**УДК 281.2(476.7) "19/20"**

# МАТЭРЫЯЛЫ ПА ГІСТОРЫІ ХРАМАЎ І МАНАСТЫРОЎ УНІЯЦКАГА ПЕРЫЯДУ НА СТАРОНКАХ БЕЛАРУСКІХ ЕПАРХІЯЛЬНЫХ ВЕДАМАСЦЕЙ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

***В.Г. РЫМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Дадзены аналіз публікацый па гісторыі храмаў і манастыроў уніяцкага перыяду (1596–1839 гг.), размешчаных на старонках Літоўскіх, Полацкіх і Гродзенскіх епархіяльных ведамасцей. Пазначаныя выданні выходзілі ў межах беларускіх праваслаўных епархій Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Прааналізаваны матэрыялы даследчыкаў царкоўнай гісторыі М. Малішэўскага і А. Шчарбіцкага, у якіх прадстаўлена становішча і лёс беларускіх прыходаў і манастыроў падчас афіцыйнага існавання ўніі. Паказваецца значнасць такіх крыніц па гісторыі цэркваў і манастыроў, як "візіты", якія складаліся падчас правядзення спецыяльных візітацый – перыядычных аглядаў епархій самімі епіскапамі альбо спецыяльна прызначанымі асобамі. Разгледжаны стан полацкага Барысаглебскага, віленскіх Свята-Троіцкага і Свята-Духаўскага, а таксама Супрасльскага манастыроў.*

***Ключавыя словы****: епархіяльныя ведамасці, гісторыя храмаў і манастыроў, царкоўная гісторыя, грэка-каталіцтва, гістарычныя крыніцы.*

**Уводзіны.** На старонках Літоўскіх, Полацкіх і Гродзенскіх епархіяльных ведамасцей другой паловы XIX – пачатку XX ст. сярод іншых гісторыка-краязнаўчых, біяграфічных, афіцыйна-дакументальных матэрыялаў прадстаўлены публікацыі, прысвечаныя гісторыі асобных цэркваў, прыходаў і манастыроў ва ўніяцкі перыяд (1596–1839 гг.).

Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г. прыўнесла ў жыццё беларускіх храмаў і манастыроў істотныя змены, звязаныя з пераводам святароў і прыхажан з праваслаўя ў грэка-каталіцтва, са стварэннем замест праваслаўнага манаства ўніяцкага манаскага ордэна базіліян, а таксама з перадачай некалі праваслаўных прыходаў і манастырскіх уладанняў уніятам. Гэтыя факты, а таксама абрадава-дагматычныя моманты, звязаныя з правядзеннем набажэнстваў і знешнім воблікам храмаў, выклікалі шмат супярэчнасцяў у жыцці прыходаў і манастыроў да моманту афіцыйнай ліквідацыі ўніі ў Расійскай імперыі ў 1839 г.

**Асноўная частка.** Значнымі і цікавымі крыніцамі па гісторыі ўніяцкіх храмаў і манастыроў з'яўляліся так званыя «візіты» (справаздачы, якія складаліся епіскапамі альбо візітатарамі епархій пасля агляду імі епархіяльных цэркваў, маёмасці манастыроў і г.д.). Візітацыя – (ад лацінскага visitatio – наведванне, агляд) арганізаваная епіскапам альбо дэканам планавая праверка падначаленых цэркваў. Адрозніваюць два віды візітацый: генеральная (епіскапская) і дэканская [1, с. 4]. Менавіта такім візітацыям і прысвечана публікацыя «Заметка о визитах, как хранилищах исторических сведений и документов» у Літоўскіх епархіяльных ведамасцях за 1869 г. [2]. «Візіты», якія былі складзены падчас рэвізій храмаў спецыяльнымі візітатарамі і захоўваліся ў саміх храмах, пасля іх вывучэння і апрацоўкі «дадут в результате красноречивые цифры: сколько было православных церквей в нашей (Літоўскай – *В.Р.*) епархии до введения унии, сколько сохранилось в предании урочищ. Сколько прежде было каплиц в приходе и сколько теперь придворных костелов. В какое время и от кого иезуиты, базилиане и доминиканы, кармелиты и другие получали права над сотнями униятских церквей и как эти колляторы патроны уничтожили остатки православия, вводили латинския обряды и наконец самыя церквы превращали в костелы» [2, с. 658–659]. Адносна ж матэрыяльнага забеспячэння святарства «візіты» – мабыць ці не адзіная дакладная крыніца таго часу, якая, акрамя іншага, сведчыла пра старажытнасць цэркваў, так як абавязковым было пазначаць час заснавання храма. З гэтых жа дакументаў бачна, у якіх цэрквах ва ўніяцкі перыяд захаваліся іканастасы.

Гэтай жа праблематыцы прысвечана публікацыя М. Малішэўскага [3], у якой ён вызначыў два віды царкоўных рэвізій – генеральная і прыватная. Першую праводзілі самі епіскапы і члены капітула кожныя два гады, другую – благачынныя штогод. Рэвізоры павінны былі, не абцяжарваючы святарства, «производить ревизию скоро, не требуя ни денег, ни каких-либо приношений, исключая самаго необходимаго – на содержание ревизора» [3, с. 278]. Першыя ўніяцкія епіскапы і мітрапаліты праводзілі рэвізіі дастаткова грунтоўна, так, што нават іх жыццё часта трапляла ў небяспеку. Найбольш падрабязна аўтар спыніўся на «візітах», праведзеных мітрапалітам К. Жахоўскім: «он решал на месте дела о разводах, о браках православных с униатами и наоборот примирял и наказывал ссорящихся, рукополагал священников, перемещал священников из одного прихода в другой» [3, с. 279]. Пасля заканчэння рэвізій заўседы праводзіліся правінцыяльныя альбо епархіяльныя саборы, якія разглядалі «візіты» і замацоўвалі вынікі працы рэвізораў.

У абавязкі візітатараў уваходзіла праверка наяўнасці ў царкве ўсяго неабходнага для набажэнстваў (аблачэнні, кнігі), захавання святаром чысціні і ахайнасці ў алтары, выканання ім належна сваіх абавязкаў, а таксама наколькі часта прыхажанамі наведваецца споведзь [3, с. 279]. Магчымасці рэвізора былі значнымі і прыраўноўваліся да кансісторскага і архіпастырскага судоў [3, с. 285]. Ён на месцы разбіраў скаргі прыхажан на святара і караў святароў за спачуванне праваслаўю, так як асноўнай задачай рэвізораў заўсёды заставалася распаўсюджанне ўніяцтва і тым самым скарачэнне колькасці праваслаўных [3, с. 285].

Часта святары цэркваў, якія падлягалі рэвізіі, аказвалі даволі сур'ёзны супраціў візітатарам: не давалі ім ключоў ад храма, замыкалі іх у царкве, абражалі, выганялі са сваіх дамоў і гэтак далей [3, с. 292]. Такія выпадкі адбываліся часам пры непасрэдным удзеле прыхажан. Даследуючы іх прычыну, М. Малішэўскі прааналізаваў шматлікія акты рэвізій і прыйшоў да высновы, што найбольшую ролю тут адыгрывала менавіта «громада», якая магла нават прымусіць свайго святара аддаць свой прыход іншаму, калі ен больш падабаўся прыхажанам [3, с. 292].

У часы мітрапалітаў Г. Вінніцкага і Л. Кішкі рэвізіі часцей за ўсе даручаліся базіліянам. Пасля Замойскага сабора 1720 г. для рэвізораў храмаў была складзена новая інструкцыя, якая датычылася не толькі асоб святароў, дыяканаў і самой рэвізуемай царквы, але і мошчаў, ікон, індульгенцый, усіх царкоўных таемстваў, набажэнстваў, царкоўных брацтваў і багадзельняў [3, с. 25]. Аўтар пералічыў па гадах усіх рэвізораў, якія праводзілі генеральныя візіты ў 1723–1733 гг., 1751–1797 гг. і ў 1800–1818 гг. Прыведзены таксама вытрымкі з актаў рэвізій і пастаноў паслярэвізійных саборыкаў святарства. У цэлым, рэвізіі кожнага перыяду мелі свае асаблівасці і закранаді свае праблемныя пытанні, што і адлюстраваў у сваёй публікацыі М. Малішэўскі.

У Гродзенскіх епархіяльных ведамасцях у 1904 г. быў надрукаваны артыкул святара А. Сіткевіча [4] аб мінулым Збуражскай царквы Брэсцкага павета Гродзенскай губерні на аснове вывучэння двух «візітаў» гэтай царквы за 1747 і 1802 гады, якія захаваліся ў архіве суседняй Маларыцкай царквы. Першую рэвізію праводзіў брэсцкі афіцыял А. Бянецкі, другую – генеральны візітатар Брэсцкай епархіі А. Тупальскі [4, с. 239]. У сваім нарысе аўтар распавёў пра час узнікнення царквы ў імя святога Сімяона Стоўпніка ў Збуражы, апісаў яе знешні выгляд, унутранае ўбранне і начынне, асабліва спыніўся на асобах святароў і царкоўнага прычту, а таксама пералічыў зямельныя ўладанні прыхода, апісаў сядзібу святара. Адзначалася, што ў дадзенай царкве ў пазначаныя гады было адносна няшмат каталіцкіх наваўвядзенняў, меўся іканастас і абразы ў ківотах.

Падобны артыкул протаіерэя П. Пятроўскага [5], заснаваны на вывучэнні дакументаў, якія адносіліся да гісторыі царквы, уяўляе сабой акрамя ўсяго іншага ўспамін і апісанне асабістых уражанняў аўтара пра Хацїслаўскую царкву, размешчаную ў яго роднай вёсцы. Ён выявіў цікавыя для сябе факты, што гэтая царква да 1828 г. лічылася ў дакументах як рымска-ўніяцкая, а пасля 1828 г. была перайменавана ў грэка-ўніяцкую. Менавіта гэты год, згодна меркаванняў аўтара, пачатковы ў уз'яднальным працэсе ў сваім родным прыходзе. Другой заўважанай ім асаблівасцю было папярэджанне не купляць арганы ў цэрквы па прыкладзе каталіцкіх касцёлаў, а вучыцца спяваць падчас набажэнстваў, прычым ён перадаў свае асабістыя ўспаміны аб адносінах простага народа да арганаў у храмах: «органы выдумали ксендзы, чтобы не совершать богослужения; – а ленились Богу молиться» [5, с. 883]. Характэрна, што прыхаджане Хацїслаўскай і бліжэйшых цэркваў вучылі царкоўныя спевы, выконваючы сваю паўсядзенную працу. Трэццяй асаблівасцю Хацїслаўскай царквы было ўсталяванне ў пазначаны час іканастаса, як адзначаў аўтар, «задолго до возсоединения с православием» [5, с. 884], а таксама ўладкаванне алтару па праваслаўных канонах. Богаслужэбныя кнігі замяняліся маскоўскімі выданнямі, захоўваліся толькі ўніяцкія Евангеллі, заставаліся і некаторыя каталіцкія элементы ў набажэнстве (чытаныя імшы па буднях) і ў малітве (успамін filioque у Сімвале Веры), уніяцкіх святароў у народзе часам называлі ксяндзамі, некаторыя з іх нават пасля ўз'яднання не насілі барады і рызы, стрыглі валасы.

На прыкладзе адной Хацїслаўскай царквы можна меркаваць і пра іншыя вясковыя прыходы канца XVIII – пачатку XIX ст. на Гродзеншчыне, аднак, на наш погляд, не трэба разглядаць адну гэтую царкву ў якасці агульнапрынятай практыкі, так як у іншых храмах былі свае асаблівасці ва ўспрыняцці перадуз'яднальных рэформ 20–30-х гадоў XIX ст.

У № 34 Полацкіх епархіяльных ведамасцей за 1909 г. быў надрукаваны артыкул пра полацкі Барысаглебскі манастыр, які ў XVI ст. належыў полацкаму епіскапу Глебу Корсаку. Уладыка раздаваў манастырскія землі і маёмасць сваім сябрам і сваякам з умовай аддачы часткі прыбыткаў «чернецкому монашеству». [6]. Кароль Стэфан Баторый загадаў вярнуць маёмасць духоўным асобам «в заведывание», але накіраваць справу ў суд удалося толькі полацкаму архіепіскапу (ужо ўніяцкаму) Герману Загорскаму ў 1597 г. «за опустошение монастыря и неправильный забор имений» [6, с. 624]. Корсакі штогод абавязаліся даваць манастыру «по 30 коп грошей, 28 бочек ржи, 28 бочек яроваго хлеба на удержание духовных лиц, церковь призирать и монастырь выстроить» [6, с. 625], аднак дамовы яны не выканалі, і тады полацкі архіепіскап Ясафат Кунцэвіч выклікаў іх у суд і патрабаваў вярнуць 60 000 злотых ці хаця б

прывезці ў манастыр «1 000 бочек хлеба и 600 коп грошей» [6, с. 625]. Падчас напісання свайго артыкула аўтар кіраваўся копіяй пазоўнай заявы Я. Кунцэвіча ад 1620 г.

У № 21 Літоўскіх епархіяльных ведамасцей за 1868 г. быў надрукаваны артыкул [7], у якім паведамлялася, што ў Вільні да канца XVIII ст. існаваў жаночы праваслаўны манастыр спачатку пры Троіцкім, а потым Свята-Духаўскім мужчынкім манастыры. Адзначаныя жаночыя манастыры заўсёды былі замацаваны за больш буйнымі мужчынскімі, у сувязі з чым вельмі мала дакументаў, якія б датычыліся жаночых манастыроў, выходзіла і захавалася. Аднак і па застаўшыхся матэрыялах можна было прасачыць іх гісторыю, што аўтар і зрабіў.

Сваёй задачай А. Шчарбіцкі паставіў вызначыць недобрасумленнасць уніяцкага пісьменніка К. Нясецкага адносна наўмысна скажоных ім дадзеных пра тое, што Свята-Троіцкі жаночы манастыр заўсёды належыў базіліянкам, у той час як ён быў заснаваны ў 1520 г. ці яшчэ раней, а менавіта да прыняцця ўніі і ўтварэння ордэна базіліян [7, с. 925]. Акрамя таго, манастырам увесь час дапамагала віленскае праваслаўнае Троіцкае брацтва. Яшчэ адзін уніяцкі гісторык І. Стральбіцкі сцвярджаў, што дадзены манастыр «был забыт и оставлен вследствие отщепенства, принесеннаго из Греции, и стоял в запустении в продолжении долгого времени» [7, с. 925]. На самой жа справе, як сцвярджае аўтар, ён спусцеў толькі напачатку XVII ст., калі быў канчаткова адабраны ў праваслаўных уніяцкім імтрапалітам Іпаціем Пацеем. Праваслаўныя манахіні, аказаўшыся па-за сценамі свайго манастыра, не пакінулі Вільню, а знайшлі прыстанак пры Свята-Духавым манастыры і пачалі ўладкоўваць новы Балагавешчанскі жаночы манастыр, які «был непосредственным преемником Троицкаго женскаго монастыря» [7, с. 928]. Аўтар апісаў манастырскую маёмасць і будынкі, а таксама пералічыў манахінь манастыра, якія паходзілі з роду Сапегаў.

Адным з асноўных цэнтраў духоўнага жыцця Вільні спачатку для праваслаўных, а потым і для ўніятаў стаў віленскі Свята-Троіцкі манастыр, якому прысвечана даследаванне прафесара А. У. Шчарбіцкага [8]. Аўтар прасачыў гісторыю манастыра з моманту яго заснавання, апісаў яго знешні выгляд у розныя адрэзкі часу, узгадаў пра пахаванні, размешчаныя ў склепах манастыра, не забыўся і на знакамітую тыпаграфію, і пра віленскае Свята-Троіцкае праваслаўнае брацтва. З самага пачатку ён не збіраўся ў сваёй працы казаць пра тое, як узнікла і распаўсюдзілася ўнія, але ўзяў за мэту «выяснить, какое значение имел Св.-Троицкий монастырь в деле ее распространения» [8, с. 271]. Да ўвядзення ўніі і ў пачатковы перыяд яе існавання ён «служил опорою, центром, вокруг котораго группировались силы православных» [8, с. 284].Назіраючы за гэтым, мітрапаліт І. Пацей задумаў адабраць у праваслаўных іх галоўную духоўную апору іператварыць яе ў буйны цэнтр уніяцкага жыцця. Перш за ўсе была знішчана прывілея Свята-Троіцкага брацтва на патранат над манастыром. Братчыкі доўга не жадалі паступіцца сваім манастыром і аддаць яго ўніятам, у выніку чаго была складзена змова супраць архімандрыта І. Руцкага, якая была раскрыта, дзякуючы Я. Кунцэвічу. Чарговая буйная сутычка братчыкаў з міратпалітам І. Пацеем за манастыр адбылася на варшаўскім сойме 1609 г., які, як ні дзіўна, прайшоў з карысцю для праваслаўных, што стала даволі адчувальным ударам па ўніі. Аднак гэта была адзіная перамога праваслаўных, усе далейшыя спробы адстаяць манастыр былі беспаспяховымі. Замацаваўшы за сабой манастыр, яго настаяцель І. Руцкі ўзяўся за стварэнне базіліянскага ордэна. Манахі-базіліяне клапаціліся пра тое, каб сабраць для свайго манастыра як мага больш бенефіцыяў і прыбытковых маёнткаў. Менавіта пры Свята-Троіцкім манастыры быў заснаваны і першы базіліянскі навіцыят, а таксама багаслоўская школа для навучання манахаў.

У далейшым у Свята-Троіцкім манастыры праходзілі пышныя ўрачыстасці ў гонар адзінага ўніяцкага святога Я. Кунцэвіча. А. Шчарбіцкі прывеў звесткі пра адносіны троіцкіх базіліян з іх праваслаўнымі суседзямі – інакамі Свята-Духава манастыра, у друкарні якога былі выдадзены знакамітыя творы праваслаўных палемістаў «Фрынас», «Апакрызіс» і «Антыграф». Свята-Духаў манастыр стаў прыстанкам Віленскага праваслаўнага брацтва, якое сфарміравалася пасля ліквідацыі Свята-Траецкага брацтва.

У гэтую ж работу ўключаны матэрыял аб жаночым манастыры пры Свята-Троіцкай царкве, пра які ўзгадана вышэй, а таксама пра дзейнасць Трокскай архімандрыі, якая належыла манастыру, дадзены кароткія біяграфічныя нататкі пра кожнага з настаяцеляў манастыра, пачынаючы з даўніяцкага і канчаючы постунійным перыядам. У якасці дадатку апублікавана «Извлечение из отчета о ревизии мужскаго и женскаго виленских базилианских монастырей в 1836 г.» [8, с. 451–452].

У Літоўскіх епархіяльных ведамасцях у 1864–1866 гг. быў надрукаваны аб’емны артыкул архімандрыта Мадэста «Супрасльский Благовещенский монастырь» [9]. На першапачатковых этапах уніі настаяцель манастыра І. Масальскі не падпарадкоўваўся мітрапаліту І. Пацею, якога ён у 1601 г. разам з манахамі «огласил недостойным и лишенным епископскаго сана и запретил братии монастыря повиноваться ему» [9, с. 111], у выніку чаго Масальскі быў пазбаўлены сана і адхілены ад настаяцельства, а да 1614 г. Супрасльскі манастыр быў гвалтоўна адабраны на ўнію [9, с. 112]. Публікацыя змяшчае ў сабе матэрыялы пра стан Супрасльскага манастыра ад прыняцця ўніі да ўз’яднання з праваслаўем, аб страце

ім самастойнасці, аб умяшальніцтве ў манастырскія справы фундатараў Хадкевічаў і іх нашчадкаў супраць волі ўніяцкіх мітрапалітаў: «достопочтенный отец Митрополит, – если найдет нужным для порядка церковнаго богослужения, посетить монастырь; – должен делать это с моего ведома, как фундатора, впрочем так, чтобы ни сам отец Митрополит, ни кто другой от него уполномоченный, не касался дел светских угодий, завещанных монастырю Супрасльскому; потому что это, по правам нашим, принадлежит мне и моему потомству» (з ліста Аляксандра Хадкевіча, ваяводы Трокскага і старасты Барысаўскага ад 1626 г.) [9, с. 158]. Акрамя таго, дадзены фундатар назіраў неблагапрыстойнае жыццё манахаў, якое не супадала ні з адным манастыркім уставам, і ўзяў на сябе паўнамоцтвы па абмежаванню колькасці манаскай абшчыны. Прымаць у манастыр манахаў архімандрыт павінен быў напярэдадні абмеркаваўшы кожную кандыдатуру з фундатарам [9, с. 159–160]. Пасля таго, як архімандрыт Сянчыла адмовіўся падпісаць такія ўмовы абуральнага ўмяшальніцтва свецкага чалавека ў царкоўнае жыццё, А. Хадкевіч прыстрашыў яго пазбаўленнем архімандрыцтва, астатнія манахі «из страха» падпісаліся [9, с. 163]. Дадзены ліст Хадкевіча быў асуджаны мітрапалітам І. Руцкім, а манахам было загадана падпарадкоўвацца толькі ўладзе свайго епіскапа, а не свецкай асобе, што было падцверджана і судом. Саступіўшы месца ў справе кіравання манастыром, Хадкевіч адабраў у абіцелі частку маёнткаў і прыбыткаў.

Асобныя раздзелы публікацыі прысвечаны апісанню хваляванняў падчас абрання ў архімандрыты Феадосія Віслоцкага і гісторыі двух манастыроў, якія залежылі ад Супрасльскага манастыра: Варшаўскага і Кузьніцкага. Асаблівая ўвага ў даследаванні архімандрыта Мадэста нададзена супрасльскай друкарні, адчыненай пры мітрапаліце К. Жахоўскім, і яе выданням. Есць у артыкуле і раздзел па гісторыі Супрасльскай епархіі ў перыяд уваходжання Беластокскай вобласці ў склад Прусіі.

Гісторыі беларускіх праслаўных і ўніяцкіх манастыроў у складзе Расійскай імперыі прысвечана чарговая публікацыя прафесара А. У. Шчарбіцкага [10], якая з'яўляецца своеасаблівым сінтэзам аўтарскага даследавання і публікацыі дакументаў пра тое, што ўяўлялі сабой заходне-рускія архімандрыі, і вылучае два іх віды: 1) тыя манастыры, настаяцелі якіх насілі тытул архімандрытаў; 2) манастыры, якія атрымалі фундушы ад вялікіх князёў літоўскіх ці ад каралёў Рэчы Паспалітай і лічыліся маёмасцю Кароны [10, с. 580–581]. Акрамя таго, прадстаўлена жыццё манахаў базіліянскага ордэна ў архімандрыях, якое характарызавалася свавольствам архімандрытаў, іх імкненнем да матэрыльяных дабротаў, прывілеяў і бенефіцыяў.

Адной з самых старажытных у Літве з'яўлялася Трокская архімандрыя, і А. У. Шчарбіцкі распавядаў пра тыя цэрквы, якія ўваходзілі ў яе склад з XIV ст., пра тое, якія фундушы ёй належылі, пра ўніяцкі перыяд у яе гісторыі. Тут жа былі надрукаваны дакументы па гісторыі заходне-рускіх манастыроў, здабытыя ім у розных архівах і бібліятэках:

– урыўкі з «Дневника» віленскага Свята-Троіцкага манастыра, які вёўся з 1671 па 1755 гг.;

– загад Трокскага земскага суда Еразмусу Стравінскаму аб звароце Мелаўшчызны, якая належыла Трокскаму Прачысценскаму манастыру ад 13 лютага 1603 г.;

– выклік у суд Еразмуса Стравінскага па скарге трокскага святара Філіпа Івановіча аб незаконным уладанні Мелаўшчызнай ад 6 чэрвеня 1609 г.;

– ліст Іосіфа III мітрапаліта Кіеўскага да падскарбія Івана Андрэевіча з паведамленнем, што ён пастрыг у манахі рэкамендаванага ім святара Васіля на Трокскую архімандрыю, на месца ігумена Сімана, які за свае ўчынкі быў адхілены ад набажэнстваў;

– «Выпись из книг справ гродских замку господарского воеводства Троцкого. Жалоба священника трокской Пречистенской церкви Филиппа Ивановича и земянина Ивана Баки на чернцов униатских виленского Свято-Троицкого монастыря, явившихся в Троки по приказанию И. В. Рутского. Для отнятия у православных Перчистенской церкви от 19 сентября 1619 г.»;

– перадатачны запіс Даніїла Солтана, па якім ён саступае мітрапаліту Руцкаму свае права на царкву і манастыры, размешчаныя ў Троках і Вільне, з належачай ім маёмасцю ад 18 чэрвеня 1620 г.;

– копія пратэстацыі трокскага святара Філіпа Івановіча на трокскіх бернарданыў аб гвалце і рабаваннях за 1690 г.

Другой была прадстаўлена гісторыя Тараканскай архімандрыі, размешчанай у Гродзенскай губерні Кобрынскага павета. Дакументаў па ёй надрукавана не было.

**Заключэнне.** Такім чынам, сярод іншых публікацый, размешчаных на старонках беларускіх епархіяльных ведамасцей і прысвечаных гісторыі грэка-каталіцтва, у асобны раздзел можна вылучыць матэрыялы, прысвечаныя гісторыі цэркваў і манастыроў, якія некалі былі праваслаўнымі, але з цягам часу сталі ўніяцкімі ў выніку гвалтоўных дзеянняў з боку дзяржавы і прадстаўнікоў уніяцкай і каталіцкай цэркваў. Асабліва шмат матэрыялаў прысвечана віленскім Троіцкаму і Свята-Духаву манастырам. Дадзеныя публікацыі ўяўляюць сабой цікавы і каштоўны від гістарыяграфічных крыніц, якія могуць быць выкарыстаны падчас вывучэння гісторыіі ўніяцкіх манастыроў і цэркваў Беларусі.

Прааналізаваныя ў дадзеным артыкуле публікацыі заснаваны на шырокім факталагічным матэрыяле, спалучаюць у сабе не толькі аўтарскі погляд на гісторыю ўніяцкіх цэркваў і манастыроў, але і

выкарыстанне шырокага кола архіўных крыніц, сярод якіх галоўнае месца займаюць так званыя «візіты». Асноўная ўвага аўтараў разгледжаных даследаванняў нададзена такім фактам, як праблемы маёмасці і прыбыткаў прыходаў і абіцеляў, стан манаства і святароў, непаразуменні паміж праваслаўнымі прыхаджанамі і ўніятамі. Аўтары гэтых артыкулаў былі праваслаўнымі вернікамі і таму іх цікавіла не толькі сама гісторыя цэркваў і манастыроў, але і тыя страты, якія панеслі іх аднаверцы падчас існавання ўніі, бо другая палова XIX ст. стала перыядам сапраўднага «збірання» страчанай спадчыны праваслаўнай царквы. Большасць даследаванняў, безумоўна, прысвячалася самым буйным і знакамітым манастырам, але часта аўтары звярталіся і да гісторыі сваіх родных вясковых прыходаў. Даследчыкі займаліся як вывучэннем даўняга мінулага, так і гісторыяй храмаў першай паловы XIX ст., непасрэдна напярэдані афіцыйнай ліквідацыі ўніі ў межах Расійскай імперыі.

ЛІТАРАТУРА


1. Лісейчыкаў, Д. В. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720–1839 гг. / Д. В. Лісейчыкаў ; Дэпартамент па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Мінск : Медысонт, 2011. – 195 с.
2. Заметка о визитах, как хранилищах исторических сведений и документов // Литовские епархиальные ведомости. – 1869. – № 10. – С. 658–662.
3. Малишевский, Н. О ревизиях приходских униятских церквей / Н. Малишевский // Литовские епархиальные ведомости. – 1874. – № 35. – С. 278–280; № 36. – С. 284–286; № 37. – С. 291–294. – 1878. – № 3. – С. 24–26; № 4. – С. 31–33; № 7. – С. 54–56; № 9. – С. 73–75.
4. Ситкевич, А. Збуражская церковь во времена унии / А. Ситкевич // Гродненские епархиальные ведомости. – 1904. – № 9. – С. 238–247.
5. Петровский, П. О последних годах унии в Гродненской губернии / П. Петровский // Гродненские епархиальные ведомости. – 1905. – № 32. – С. 882–888.
6. Древнее предание о Борисоглебском монастыре, оставленное Полоцким архиепископом Иосафатом Кунцевичем в деле с Корсаком // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1909. – № 34. – С. 622–626.
7. Несколько слов о древних женских православных монастырях в г. Вильне: Троицкаго и Благовещенскаго и о последующей судьбе перваго // Литовские епархиальные ведомости. – 1868. – № 21. – С. 923–933.
8. Щербицкий, О. В. Виленский Свято-Троицкий монастырь / О. В. Щербицкий // Литовские епархиальные ведомости. – 1885.– № 25. – С. 253–256; № 26. – С. 266–268; № 27. – С. 269–272; № 28. – С. 284–287; № 29. – С. 290–295; № 31. – С. 309–312; № 32. – С. 317–319; № 33. – С. 324–327; № 34. – С. 332–335; № 35. – С. 341–343; № 36. – С. 348–350; № 38. – С. 366–368; № 40. – С. 382–384; № 43. – С. 404–407; № 44. – С. 416–417; № 45. – С. 423–425; № 47. – С. 442–445; № 48. – С. 450–452.
9. Модест, архимандрит Супрасльский Благовещенский монастырь / архимандрит Модест // Литовские епархиальные ведомости. – 1864. – № 3. – С. 74–88; № 4. – С. 108–116; № 5. – С. 157–163; № 8. – С. 279–293; № 9. – С. 310–324; № 10. – С. 353–367; № 11. – С. 399–405; № 13. – С. 456–469; № 19. – С. 712–723; № 20. – С. 747–766. – 1865. № 3. – С. 103–114; № 4. – С. 134–155; № 5. – С. 182–197; № 23. – С. 915–926. – 1866. – № 1. – С. 13–25; № 23. – С. 988–1004; № 24. – С. 1029–1044.
10. Щербицкий, О. Материалы для истории православных и униатских монастырей в Западной России / О. Щербицкий // Литовские епархиальные ведомости. – 1868. – № 13. – С. 580–590; № 14. – С. 614–632; № 20. – С. 891–896; № 23. – С. 1061–1063. – 1869. – № 13. – С. 852–863; № 14. – С. 905–912.


*Пастуліў 7.11.2015*

## MATERIALS ON THE HISTORY UNIATE CHURCHES AND MONASTERIES PERIOD ON THE PAGES OF BELARUSIAN DIOCESAN BULLETINS SECOND HALF XIX - EARLY XX CENTURY

***V. RYMKO***

*The article analyzes the publications on the history of temples and monasteries, Uniate period (1596-1839), located on the Lithuanian, Polotsk and Grodno diocesan bulletins. These publications came out in the framework of the Belarusian Orthodox Diocese of the Russian Empire in the second half of XIX - early XX century. Materials researchers analyzed church history N. Maliszewski and A. Scherbitsky, which presents the status and fate of Belarusian parishes and monasteries during the official existence of the union. Specifies the significance of the sources on the history of churches and monasteries, as "visits" took place during the special visitation - periodic inspections carried out by the bishops or specially adapted individuals. Examined the state of Polotsk Borisoglebskii, Vilna Holy Trinity and St. Dukhovski and Suprasl monastery.*

***Keywords**: disocesan bulletins, history of temples and monasteries, ecclesiastical history, Greek-Catholicism, historical sources.*